View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by BSU Digital Library

# КАНСТЫТУЦЫЙНЫЯ НОРМЫ Ў АГУЛЬНАЗЕМСКІХ ГРАМАТАХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

***Т.І. Доўнар,*** *доктар юрыдычных навук, прафесар, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Адна з першых грамат (прывілеяў) у Вялікім Княстве Літоўскім, якая мела агульнадзяржаўны характар, была прынята ў Вільні 20 лютага 1387 г. з мэтай рэалізацыі Крэўскай уніі. Яна паклала пачатак ажыццяўленню дзяржаўнай падтрымкі каталіцызму. У ёй гаварылася аб правах толькі тых асоб, якія прынялі каталіцкую веру. 22 лютага 1387 г. ў Лідзе прымаецца грамата, якая надзяляла шырокімі правамі і землямі каталіцкае духавенства, а з дзяржаўнай юрысдыкцыі выключала ўсё залежнае ад каталіцкай царквы насельніцтва. Грамата ад 28 красавіка 1387 г. замацоўвала права князя Скіргайлы (Івана) на кіраванне Вялікім Княствам пасля ўступлення на польскі трон Ягайлы. Апошні абяцаў «крепко блюсти его княженья и державы» [1, с.70]. Тым самым прывілей юрыдычна замацоўваў захаванне дзяржаўнай самастойнасці ВКЛ. Нягледзячы на пацвярджэнне правоў Скіргайлы на Полацкае і Трокскае княствы і перадачу ў яго распараджэнне значнай часткі дзяржаўных зямель, заканадаўца не лічыў грамату актам прыватна-прававога падаравання, а падкрэсліваючы важны агульнадзяржаўны характар, называў яе «Праўдай» - «На сем на всем дал есмь правду крепкую…»…[1, с.72].

Пазней замацаванне суверэнітэту Вялікага Княства Літоўскага было афармлена Востраўскім пагадненнем 1392 года, па якім вялікі князь Скіргайла здымаўся з пасады вялікага князя і пераводзіўся на княства Кіеўскае, а паўнамоцтвы вялікага князя перадаваліся князю берасцейскаму і гарадзенскаму Вітаўту (Юрыю, Аляксандру).

Узаемаадносіны Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай ў XV ст. рэгламентаваліся новымі дагаворамі, у тым ліку Віленска-Радамскай уніяй 1401 г., замацаванай спецыяльнай граматай. У ёй кіраўніцтва дзвюх дзяржаў узаемна абяцала падтрымліваць адзін аднаго і быць у пастаянным саюзе, што было вельмі важным у справе аб'яднання сіл усходнееўрапейскіх народаў у іх барацьбе з крыжакамі. У 1413 г. заключаецца новая Гарадзельская ўнія, заканадаўча афармленая сумеснымі граматамі Ягайлы і Вітаўта, якія больш мелі прапагандысцкі характар. Многія палажэнні іх толькі дэкларавaліся, магчыма, з мэтай задобрыць рымскую курыю пасля разгрому крыжакоў пад Грунвальдам. У арт. 1 сцвярджалася, напрыклад, што землі ВКЛ нібыта далучаны да каралеўства Польскага [1, с.74]. Гэтае палажэнне супярэчыла арт. 11 граматы, дзе гаварылася, што феадалы ВКЛ не будуць выбіраць сабе новага князя без згоды караля Ягайлы і польскіх паноў, а таксама пасля смерці польскага караля без нашчадкаў палякі не павінны выбіраць сабе новага караля без згоды вялікага князя і рады ВКЛ [1, с.76]. Увогуле грамата сведчыла не толькі пра захаванне самастойнасці дзяржавы, але і пра выбарнасць пасады вялікага князя. Патрэбна адзначыць, што некаторыя палажэнні граматы мелі дыскрымінацыйны характар, бо ў іх рэгламентаваліся правы толькі каталіцкага насельніцтва, у тым ліку права займаць пасады. Гэтыя запісы потым неаднойчы аспрэчваліся літвінамі. Так, у 1448 г. на польскім сойме ў Любліне літвіны афіцыйна заяўлялі аб зневажальным характары Гарадзельскага прывілея.

15 кастрычніка 1432 г. у Гародне была абвешчана ад імя Ягайлы важная агульнадзяржаўная грамата, якая стала юрыдычнай падставай для кансалідацыі феадалаў у агульнае прывілеяванае саслоўе шляхты. У ёй гаварылася, што з мэтай захавання адзінства дзяржавы праваслаўныя феадалы надзяляюцца такімі ж падараваннямі і прывілеямі, як і каталікі. Таксама ў агульназемскай грамаце вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча ад 6 мая 1434 г. заканадаўча пацвярджалася роўнасць правоў усіх феадалаў, у тым ліку адносна права карыстання гярбамі і іншымі знакамі шляхецтва. Усім феадалам гарантавалася права валодання маёнткамі, перадачы іх у спадчыну, або распараджэння на іншых законных падставах. Важным і новым быў артыкул, якім вялікі князь абяцаў нікога не караць па даносе або тайным абвінавачванні, а разглядаць справы публічна ў судовым парадку і ў адпаведнасці з законамі дзяржавы. Грамата гарантавала асабістую свабоду і недатыкальнасць асобы шляхціца і інш.

Важным этапам у заканадаўчым развіцці дзяржавы з’явілася выданне вялікім князем Казімірам граматы ад 2 мая 1447 г. Казімір станавіўся каралём Польшчы і таму павінен быў упэўніць літвінаў, што інтарэсы ВКЛ не пацерпяць страты. Грамата забараняла ўраду раздаваць дзяржаўную маёмасць і пасады замежнікам, замацоўвала суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць ВКЛ, пацвярджала роўныя правы ўсёй шляхты, у тым ліку права свабодна выязджаць за межы дзяржавы. Прынцыпы недатыкальнасці асобы і яе маёмасці, адказнасці толькі за віну і ў судовым парадку пашыраліся і на простых людзей. Рэгламентаваўся прынцып індывідуалізацыі адказнасці, бо гаварылася, што «ни жена за проступку мужа своего, и ни отец за проступку сына, а ни прироженный, а ни слуга» не нясуць адказнасці [1, с. 82]. Грамата пацвярджала права землеўласнікаў на валоданне землеўладаннямі, рэгламентавала права пераходу феадальных маёнткаў па спадчыне, прычым закранала і правы жанчын. Так, пасля смерці шляхціца або гараджаніна яго ўдава працягвала валодаць маёнткам мужа да таго часу, пакуль зноў не выходзіла замуж. Калі ж муж раней аформіў ёй “вена” (частку маёмасці), яна ўвогуле магла распарадзіцца ім па сваім жаданні. Абвяшчалася права жанчын свабодна, па сваёй волі выходзіць замуж. Аднак, павялічваючы правы феадалаў, палажэнні граматы значна абмяжоўвалі правы сялян. У ёй замацоўвалася судова-адміністрацыйная ўлада феадалаў над залежным насельніцтвам, у тым ліку адносна права ажыццяўлення суда і збору падаткаў.

Уступленне на вялікакняжацкі трон Аляксандра з’явілася падставай да выдання новай агульназемскай граматы 1492 г. Выключнае дзяржаўна-прававое значэнне гэтай граматы стала прычынай яе назвы ў гісторыка-прававой літаратуры – «малая феадальная канстытуцыя», або«генеральны прывілей» [3, с. 149]. Асабліва важнае значэнне мелі нормы, якімі абмежоўвалася ўлада вялікага князя з боку рады. Усе дзяржаўныя пытанні і судовыя пастановы, якія былі вырашаны з панамі-радай, вялікі князь не мог «змяняць, выпраўляць або перапарадкоўваць» [1, с. 89-90]. Фактычна яго прававое становішча вызначалася не як уладара-вотчынніка, а як вышэйшай службовай асобы ў дзяржаве [2, с. 34]. У грамаце ўпершыню замацоўваліся прынцыпы міжнароднай палітыкі ВКЛ – падтрыманне добрасуседскіх адносін з іншымі дзяржавамі, прытрымліванне заключаных пагадненняў аб міры, саюзах і канфедэрацыях. Гаварылася таксама аб краінах, куды звычайна пасылаліся пасольствы - Масковія, Польшча, Заволжская Арда, Валахія, княства Мазавецкае, Прусія, Лівонія, Пскоў, Вялікі Ноўгарад, Цвер, Разань і інш. [1, с. 87].

Агульназемскія граматы выдаваліся і пазней, у тым ліку пасля прыняцця Статута 1529 года (1506, 1529, 1547, 1551, 1563 гг. і інш.). Як правіла, яны абагульняліся і паўтараліся на больш высокім тэарэтычным узроўні палажэнні папярэдніх грамат. Аднак некаторыя з іх утрымлівалі шэраг новых і вельмі важных палажэнняў. Так, Бельская грамата 1564 г. аб’яўляла ўтварэнне і выбарнасць новых судовых органаў для шляхты і іх аддзяленне ад адміністрацыі. Віленская грамата 1563 г., якая мела мэтай недапушчэнне міжусобнай вайны паміж рознымі канфесіямі хрысціянства ва ўмовах Рэфармацыі, аб’яўляла, што не толькі каталікі, а ўсе хрысціяне маюць права карыстацца прывілеямі шляхты. У Віленскай грамаце 1565 г. заканадаўча афармлялася дзейнасць павятовых соймікаў – мясцовых прадстаўнічых органаў шляхты, якія сведчылі аб зараджэнні т. зв. шляхецкай дэмакратыі [4, с.14-15].

У цэлым агульназемскія граматы (прывілеі) мелі важнае значэнне ў грамадска-палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага. Яны не толькі сведчылі аб зараджэнні асноў канстытуцыяналізму, але і стваралі юрыдычныя падставы для правядзення ў XVI ст. агульнай сістэматызацыі заканадаўства.

## *Список литературы*

1. Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права / Я. Юхо [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2000. — 127 с.
*2.* Васілевіч, Р. А. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі / Р.А. Васілевіч, Т.І. Доўнар, І.А. Юхо. – Мінск: ВТАА “Права і эканоміка”, 2001. – 363 с.
3. Юхо, Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі / Я.А. Юхо. – Мінск:

Універсітэцкае, 1992. – 270 с.
4. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / Т.І. Доўнар, У.М. Сатолін, Я.А. Юхо; рэдкал. Т.І. Доўнар [і інш.]. – Мінск: Тэсей, 2003. – 352 с.